небудзь выправіць, дапісаць, удакладніць, зрабіць больш дакладным ў дадзеным тэксце. Усе выпраўленні, прапанаваныя вучнямі, абмяркоўваюцца і ўносяцца ў тэкст. Адрэдагаваны тэкст запісваецца школьнікамі. Работа па рэдагаванні можа і павінна ўключацца амаль у кожны ўрок беларускай мовы як праца над словам (словаформай), словазлучэннем, сказам і тэкстам.

Заключным этапам навучання рэдагаванню з'яўляецца фарміраванне ўменняў самарэдагавання, г. зн. праверкі і самаўдасканалення ўласнага тэксту, якое выконваецца вучнямі пасля падрыхтоўкі ўласных творчых работ, г. зн. на апошнім этапе ўрока, калі скончана напісанне тэксту. З гэтай мэтай звычайна выкарыстоўваюцца памяткі па самаправерцы, у якіх прапаноўваецца парадак працы па ўдасканаленні тэксту сваёй работы. Пры самаправерцы настаўнік аказвае індывідуальную дапамогу вучням. Калі школьнік не можа сам пабачыць памылку ў сваёй працы, то настаўнік можа ўказаць тое месца, над якім вучань павінен яшчэ папрацаваць. Прама ўказваць на памылку можна толькі тады, калі настаўнік можа пераканацца ў няздольнасці вучня выправіць яе самастойна. Самарэдагаванне з'яўляецца дзеяннем самакантролю за сваім маўленнем.

Такім чынам, уменне кантраляваць сваё маўленне і ўносіць у яго карэктывы станоўча ўплывае на маўленчую дзейнасць вучняў, у прыватнасці, на ўменне гаварыць і пісаць.

**Гарбачык М.Р.**
*(Брэст, УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»)*

## СУЧАСНАЯ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ КАНЦЭПЦЫЯ Ў АДУКАЦЫІ

Культуралагічная канцэпцыя ў адукацыі, якая афармляецца ў цяперашні час як філасофска-педагагічная парадыгма, з'яўляецца лагічным працягам працэсу афармлення філасофіі адукацыі ў сучасных усходне-еўрапейскіх краінах.

М. Т. Аляксееў, Ф. Т. Ліхачоў, У. М. Рагозін, Т. Б. Сяргеева лічаць, што выдзяленне філасофіі адукацыі з агульнай філасофіі дэтэрмінавана некалькімі фактарамі: а) праблемнасцю статуса філасофіі ў сучаснай культуры і праблемнымі сітуацыямі ў самой культуры; б) з'яўленнем новых галін педагагічных ведаў; в) крызісам педагагічнай практыкі і педагагічнай навукі; г) рэфармаваннямі сістэмы адукацыі пры адсутнасці мэтаў і канцэпцый рэформаў, якія праводзяцца; д) крызісам адукацыі, як крызісам сацыяльных формаў навучання і выхавання, што заключаецца

ў распадзе гістарычнай традыцыі; е) думкай аб адукацыйных інстытутах як пра нейкія асобыя, ізалявана існуючыя па-за кантэкстам сацыяльнай рэальнасці; ж) дыскрэтнасцю ў аднаўленні гісторыка-культурнай традыцыі; з) тэхналагізацыяй грамадскага падзелу працы ва ўзнаўленні гуманітарных ведаў, адсутнасцю культуры спажыўцоў і атрымальнікаў ведаў у адукацыйных сістэмах, наяўнасцю працяглага перыяду палітычнага ўтапічнага валюнтарызму ў галіне адукацыі і выхавання. Культуралагічны падыход да працэсаў адукацыі абумоўлены сфарміраванай да цяперашняга часу філасофска-педагагічнай традыцыяй. Розныя філасофскія аспекты ўзаемадзеяння культуры і адукацыі разглядалі П. Т. Шчадровіцкі, В. М. Розін, Б. Т. Бястужаў-Лада, С. А. Смірноў, М. У. Карлаў, М. М. Кузьмін. Важна адзначыць, што частка даследчыкаў працэсу адукацыі асабліва выдзяляюць базавую ролю культуры ў працэсах навучання і выхавання (Л. У. Ільчанка, А. Я. Ласкутова, А. У. Міронаў, З. Я. Рахматуліна, У. Т. Фаменка, І. У. Абакумава, І. У. Дземчанка, А. Дз. Маскоўчанка).

Так, Маскоўчанка лічыць, што адным з асноўных прынцыпаў сучаснай адукацыі з'яўляецца геакультуралагічны прынцып; сутнасць гэтага прынцыпу, як лічыць вучоны, заключаецца ў тым, што важны ўлік мае прынцыпіяльна адрозненне заходніх адукацыйных сістэм ад усходніх. Ён лічыць, што сучасная адукацыя павінна ўлічваць як дасягненні заходніх адукацыйных школ, звязаных з высокатэхналагічнымі дасягненнямі, у тым ліку і ў галіне інфармацыйна-камп'ютарных тэхналогій, так і дасягненнямі ўсходняй культуры, якая адрозніваецца "тонкімі" тэхналогіямі, што закладзена ў філасофскіх уяўленнях усходняга чалавека.

У апошні час ідэя культуралагічнага падыходу і культуралагічная канцэпцыя адукацыі атрымлівае ўсе большае прызнанне ў навуковым педагагічным асяроддзі.

Культурацэнтрызм, як лічыць А. С. Запясоцкі, з'яўляецца метадалагічнай асновай адукацыі, якая прадуледжвае нарматыўную сістэму ведаў, якія фарміруюць асобу як цэласны і арганічны суб'ект культуры. Адукаванасць у гэтай канцэпцыі разглядаецца як гармонія самабытнасці і ўніверсальнасці, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці і адначасовай адкрытасці іншай культуры. Асноўваючыся на культурацэнтрысцкай канцэпцыі, даследчыкамі ў галіне філасофіі адукацыі прадстаўлена мадэль дадзенай канцэпцыі ў наступным структурна-кампанентным выглядзе: адукацыйнае ядро, культурны ўзор, які ўключае сучасныя тэхналогіі і спосабы камунікацыі; культура як ідэалогія і сістэма каштоўнасцей, ментальнасць; цывілізацыйная акрэсленасць і ідэнтычнасць.

У сучасная педагагічнай літаратуры адзначаюць два падыходы: культурацэнтрычны і культуралагічны. Асаблівую ролю ў культуралагічнай канцэпцыі займае свабода суб'ектаў навучання.

Умовай сучаснай адукацыі, як лічаць У. М. Кандрацьеў, Л. Ф. Матроніна, з'яўляецца яе цэласнасць у маштабах усёй планеты. Гэта абумоўлена сучаснымі глабальнымі праблемамі, а новая якасць цэласці дасягаецца рознымі сродкамі (тэхналогіямі), перш за ўсё – інфармацыйнымі. Стварэнне адзінай інфармацыйнай прасторы, супольнасці сецевых структураў з'яўляецца як умовай глабалізацыі, так і ўмовай сучаснай адукацыі.

В.А. Маслава вылучае наступныя падыходы да разумення культуры: апісальны, вартасны, дзейны, функцыянальны, нарматыўны, духоўны, дыялагічны, інфармацыйны, сімвалічны, тыпалагічны. Вылучэнне такіх падыходаў сведчыць пра тое, што лінгвакуьтуралагічны аналіз мовы як найбольш яркай з'явы культуры ў яе метадалогіі зыходзіць з азначэння аб дамініруючай ролі мовы ў станаўленні і развіцці асобы.

**Гладун Т.Г., Левонюк А.Е.**
*(Брест, УО «БрГУ имени А.С. Пушкина»)*

## АЛГОРИТМИЗАЦИЯ ПРИ ОБУЧЕНИИ ФОНЕТИКЕ МЛАДШИХ ШКОЛЬНИКОВ

Значение изучения фонетики обусловлено, во-первых, необходимостью фонетических знаний и умений для становления у школьников всех видов речевой деятельности; во-вторых, важностью этих знаний и умений для усвоения произносительных норм, что обеспечивает эффективное осуществление коммуникативной деятельности; в-третьих, фундаментальной ролью фонематических умений в освоении орфографии и грамматики русского языка. Особую значимость фонетическая работа приобретает в условиях поликультурной начальной школы современного мегаполиса.

Недооценка знания фонетики на начальном этапе обучения русскому языку – одна из существенных причин графических и орфографических ошибок в письменных работах младших школьников. Если ребенок может установить последовательность звуков в слове, ориентируется в «звуках-соседях», различает ударные (безударные) гласные, твердые (мягкие) и глухие (звонкие) согласные звуки, то это свидетельствует о прочном фонетическом фундаменте, от которого будет зависеть его грамотность.

Хорошая фонетическая подготовка – основа преемственности в обучении языку между младшими и средними классам. В зависимости от то-